**Білет 14**

**Практычнае заданне.**

**Германскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. Палітыка генацыду насельніцтва Беларусі.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Якімі былі намеры нацысцкай Германіі адносна беларускага народа?
2. Якую палітыку праводзілі нацысты ў адносінах да дзяцей на акупіраванай тэрыторыі Беларусі?
3. Састаўце схему, якая адлюстроўвае элементы палітыкі генацыду на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.
4. У звароце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі да суайчыннікаў з нагоды 80-годдзя трагедыі ў Хатыні, адзначана, што абавязак тых, хто цяпер жыве перад загінуўшымі, - выкрыць вінаватых у масавым генацыдзе, беражліва захоўваць памяць аб тых страшных падзеях. Што павінна памятаць пра вайну сучаснае пакаленне беларусаў? Чаму?

**I. Германскі "новы парадак".** *(па матэрыялах вучэбных дапаможнікаў: «Гісторыя Беларусі 1917 г. – пачатак XXI ст. 9 клас», «Геноцид белорусского народа в годы Великой Отечественной войны» (5-9 класы))*

На тэрыторыі Беларусі германскія захопнікі ўводзілі "новы парадак" - сістэму ваенна-паліцэйскіх, палітычных, ідэалагічных, эканамічных мерапрыемстваў, накіраваных на ўстанаўленне і падтрымку акупацыйнага рэжыму.

Акупанты рабавалі і палілі гарады і вёскі, вывозілі ў Германію прамысловае абсталяванне, сыравіну, лес і жывёлу, культурна-гістарычныя каштоўнасці. Уцалелыя прадпрыемствы перадавалі нямецкім фабрыкантам і заводчыкам, а зямлю - былым памешчыкам. Людзей прымушалі працаваць па 12-14 гадзін у суткі. Тых, хто адмаўляўся, заключалі ў канцлагеры, а ініцыятараў пратэстаў расстрэльвалі.

Галоўным сродкам ажыццяўлення сваіх мэт акупанты зрабілі палітыку генацыду. Яна была накіравана на поўнае або частковае знішчэнне груп насельніцтва па расавай, нацыянальнай, этнічнай, палітычнай або рэлігійнай прыкметах. Чалавек мог стаць ахвярай генацыду па розных матывах: за прыналежнасць да камуністаў, асоб яўрэйскай нацыянальнасці, за любое непадпарадкаванне акупацыйным уладам.

З германскіх салдат і афіцэраў здымалася ўсякая адказнасць за злачынствы на акупіраванай тэрыторыі. Кіраўніцтва нацысцкай Германіі дазволіла сваёй арміі знішчаць мірнае насельніцтва заваяваных земляў любымі сродкамі: знішчаць гарады, спальваць вёскі разам з жыхарамі; забіраць у насельніцтва харчаванне і жывёлу; арганізоўваць месцы прымусовага ўтрымання савецкіх грамадзян з невыноснымі ўмовамі; прымушаць шмат і непасільна працаваць; мардаваць голадам і холадам; прымяняць расстрэлы і шыбеніцы, газавыя камеры і спальванне; распаўсюджваць эпідэміі, не аказваць медыцынскай дапамогі.

Адной з асноўных прылад знішчэння беларускага насельніцтва былі лагеры смерці - месцы масавага ўтрымання і знішчэння людзей. Усяго на акупіраванай ворагам тэрыторыі Беларусі было створана больш за 580 лагераў смерці.

Акупанты праводзілі палітыку запалохвання мірнага насельніцтва Беларусі, праводзілі карныя аперацыі і ўчынялі шматлікія расправы над насельніцтвам. За 1941–1944 гады акупанты правялі на тэрыторыі Беларусі не менш за 187 буйных карных аперацый. У ходзе карных аперацый населеныя пункты спальваліся разам з людзьмі. Усяго разбурана і спалена 209 гарадоў, не менш за 12868 сельскіх населеных пунктаў. 290 вёсак падзялілі трагічны лёс Хатыні.

Знішчана больш за 3 млн мірных грамадзян і ваеннапалонных. У фашысцкае рабства пад пагрозай смерці сагнана больш за 380 тыс. чалавек, з якіх многія загінулі ў выніку невыносных умоў працы і катаванняў.

Нават дзяцей нацысты прымушалі выконваць непасільную для іх фізічную працу, марылі голадам, заключалі ў лагеры. Часта беларускіх дзяцей, асабліва з дзіцячых дамоў, выкарыстоўвалі ў якасці донараў для забеспячэння крывёю параненых нямецкіх салдат. У донарскіх лагерах дзяцей кармілі гнілымі буракамі і поліўкай з касцяной мукі, а ў тых, хто яшчэ трымаўся на нагах, забіралі кроў, колькі было магчыма. У пасёлку Чырвоны Бераг акупантамі быў створаны зборны пункт для дзяцей ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў, якіх адпраўлялі ў Германію ў якасці донараў. На сённяшні дзень устаноўлены імёны і прозвішчы толькі 15 з 1990 вывезеных, астатнія застаюцца невядомымі.

**II. З заўваг і прапаноў Э. Ветцэля па генеральным плане "Ост"** *(27 красавіка 1942 г.)*

Генеральны план «Ост» прадугледжвае, што пасля заканчэння вайны колькасць перасяленцаў для неадкладнай каланізацыі ўсходніх тэрыторый павінна складаць <…> 4550 тыс. чал. Гэтая лічба не здаецца мне занадта вялікай, улічваючы перыяд каланізацыі, роўны 30 гадам.

в) Да пытання аб беларусах.

Згодна з планам, прадугледжваецца высяленне 75 працэнтаў беларускага насельніцтва з займаемай ім тэрыторыі. Значыць, 25 працэнтаў беларусаў па плане галоўнага ўпраўлення імперскай бяспекі падлягаюць анямечванню <…>.

Непажаданае ў расавых адносінах беларускае насельніцтва будзе яшчэ на працягу многіх гадоў знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі. У сувязі з гэтым уяўляецца вельмі неабходным па магчымасці больш старанна адабраць беларусаў нардычнага тыпу, прыдатных па расавых прыкметах і палітычных меркаваннях для анямечвання, і адправіць іх у імперыю з мэтай выкарыстання ў якасці працоўнай сілы. Іх можна было б выкарыстоўваць у сельскай гаспадарцы ў якасці сельскагаспадарчых рабочых, а таксама ў прамысловасці, ці як рамеснікаў. Паколькі з імі абыходзіліся б як з немцамі і з прычыны адсутнасці ў іх нацыянальнага пачуцця, яны ў хуткім часе, прынамсі, у найбліжэйшым пакаленні, маглі б быць цалкам анямечаныя [].

## III. Найбуйнейшыя канцэнтрацыйныя лагеры і месцы масавага знішчэння савецкіх грамадзян на акупіраванай тэрыторыі Беларусі




Заўвага. Падчас расследавання Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўстаноўлена, што ў лагеры смерці "Трасцянец" нацыстамі і іх памагатымі знішчана не менш за 546 тысяч чалавек.